

**МАШЭРАЎ**
**Пётр Міронавіч**
**МАШЕРОВ**
**Петр Миронович**

Ленінская выбарчая акруга № 1 горада Мінска.

Нарадзіўся ў 1918 г. Беларус. Член КПСС з 1943 г. Адукацыя вышэйшая — закончыў Віцебскі педагагічны інстытут імя С. М. Кірава. Герой Савецкага Саюза. Герой Сацыялістычнай Працы.

1939—1941 гг.— выкладчык фізікі і матэматыкі ў Расонскай сярэдняй школе Віцебскай вобласці. У жніўні 1941 г. арганізаваў і ўзначаліў Расонскае камуністычнае падполле. З пачатку красавіка 1942 г.— камандзір партызанскага атрада імя Шчорса. У 1943 г. назначаецца камісарам партызанскай брыгады імя Ракасоўскага.

З лістапада 1943 г.— першы сакратар Вілейскага падпольнага, а з 1944 г.— першы сакратар Маладзечанскага абкомаў ЛКСМ Беларусі. З 1946 г.— сакратар, а праз год — першы сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі.

З 1954 г.— другі сакратар Мінскага, а праз год — першы сакратар Брэсцкага абкомаў Кампартыі Беларусі. У 1959 г. вылучаецца сакратаром, у 1962 г.— другім, а ў 1965 г.— першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі.

Кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС.

Член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР другога, трэцяга, пятага, шостага, сёмага, восьмага, дзевятага скліканняў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы